УДК 82.09

***Таццяна Робертаўна Багарадава***
*канд. філал. навук, дац. каф. славянскай філалогіі*
*Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта*
***Tatiana Bogoradova***
*Candidate of Philological Sciences, Associate Professor of the Department of Slavic Philology*
*of the Polotsk State University*
e-mail: bogoradova1974@yandex.ru

# НОВЫЯ РАКУРСЫ АДЛЮСТРАВАННЯ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў АПОВЕСЦЯХ І. НАВУМЕНКІ 1990-х гг.

*Разглядаецца ўвасабленне тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў аповесцях 1990-х гг. беларускага пісьменніка-ветэрана І. Навуменкі, які падчас постсавецкай рэчаіснасці пераасэнсоўваў перажытае з пазіцыі сталага чалавека. Мастак захаваў традыцыйную для яго манеру апавядання: аўтабіяграфізм, адданасць ідэалам мінулага, увагу да сацыялізацыі асобы і яе пошукаў у гістарычным быцці.*

***Ключавыя словы:*** *лірыка-псіхалагічны пачатак, аўтабіяграфізм, псіхалагізм, элегічна-мінорны аповед, «страчанае пакаленне».*

## *New Perspectives of the Reflection of the Great Patriotic War in the Novels of I. Navumenka of the 1990s.*

*The article considers the embodiment of the theme of the Great Patriotic war in the stories of the 1990s by the belarusian veteran writer I. Navumenka, who during the post-soviet reality rethought the experience from the perspective of an experienced person. The master remained faithful to the traditional manner of reflection for him: autobiography, the ideals of the past, attention to the socialization of the individual and its search in historical existence.*

***Key words:*** *lyric-psychological beginning, autobiography, psychologism, elegiac-minor narration, «the lost generation».*

### Уводзіны

У айчыннай прозе Іван Навуменка (1925–2006, удзельнік падполля, партызан, баец Ленінградскага і Украінскага франтоў) застаецца прадстаўніком той рэалістычнай прозы, у якой моцна вылучаецца лірыка-псіхалагічны пачатак. Творчасць пісьменніка спалучыла два вытокі: прыналежнасць аўтара да старэйшага пакалення, светапогляд якога фарміраваўся пад уплывам вопыту ваеннага юнацтва, і ўздзеянне «адлігі» 1960-х гг. Вынікам такога жыццёвага досведу зрабілася моцная ўнутраная, асабістая пазіцыя мастака, які не захапляўся паспешлівым прыняццем неправераных, недакладных фактаў і рашэнняў, няхай сабе і папулярных, але сумніўных авантур, – там, дзе гаворка вялася пра самыя важныя каштоўнасці. І. Навуменка як пісьменнік неаднаразова гаварыў пра сваю прыхільнасць у творчасці да аўтабіяграфізму: «У гэтым, нават, бачу свой творчы лёс, бо лягчэй за ўсё мне пішацца пра тое, што бачыў на свае вочы, або сам перажыў, ці добра ведаю з чужых слоў. Менавіта гэтыя веды я лічу самымі важнымі і значнымі для маіх кніг. <…> У сваім жыцці я, канешне, многае бачыў: быў на вайне і ў партызанах, шмат ездзіў, ведаю многія мясцовасці. І ў сваёй творчасці я апіраюся толькі на свой вопыт, на тое, што чуў, што бачыў, у чым непасрэдна прымаў удзел» [1, с. 115].

Мэта працы – прааналізаваць змест і паэтыку адлюстравання падзей Вялікай Айчыннай вайны ў аповесцях І. Навуменкі 1990-х гг. з пазіцыі пераасэнсавання яе пісьме-ннікам у абставінах постсавецкага кантэксту.

Задачы даследавання:

1) вызначэнне ідэйна-эстэтычных канцэпцый раскрыцця ваеннай тэмы І. Навуменкам на мяжы ХХ – ХХІ стст.;

2) выяўленне мастацкай спецыфікі адлюстравання кантэксту Вялікай Айчыннай вайны ў аповесцях аўтара.

### Аўтабіяграфізм трылогіі «Дзяцінства», «Падлетак», «Юнацтва»

Трылогія з аповесцей «Дзяцінства» (1991), «Падлетак» (1993), «Юнацтва»

(1994) была створана І. Навуменкам пасля вопыту напісання маштабных твораў, найперш трылогіі хрэстаматыйных раманаў 1960 – 1970-х гг. («Сасна пры дарозе», «Вецер у соснах», «Сорак трэці»). Задума новай трылогіі была выклікана ў немалой ступені і часам змены ідэалагічнай парадыгмы ў грамадстве, і разбурэннем былых афіцыйных канонаў у літаратурнай творчасці. Сутнасць пазіцыі пісьменніка ў дадзены гістарычны перыяд акрэсліла Н. Пыско: «У гэтай новай літаратурнай сітуацыі І. Навуменка застаўся верным сабе, не паддаўшыся на спакусы таго своеасаблівага мастацкага эгацэнтрызму, які захапіў хіба не большасць пісьменнікаў-сучаснікаў» [2, с. 655]. Зварот аўтарытэтнага празаіка да тэм і праблем агульнаграмадскай значнасці І. Шаладонаў вызначыў як увасабленне «адказнай спавядальнасці Івана Навуменкі перад нашчадкамі, найперш маладым пакаленнем» [3, с. 437].

Своеасаблівым ядром трылогіі аповесцей празаіка выступае быццё чалавека, якое пісьменнік разумеў як неад'емны элемент мікракосму і, адначасова, арганічную частку сусвету. Л. Сінькова адзначала, што ў гэтай трылогіі «жыццё выглядае як дзіўны кантрапункт, у якім спалучаецца, здаецца, неспалучальнае, і светлае, і цёмнае» [4, с. 76]. На фоне дамінуючай увагі да народа як масы аўтар імкнуўся падкрэсліць індывідуальнасць чалавека з гэтай масы. У творчасці пісьменніка перыяду 1990-х гг. ствараецца псіхалагічны партрэт героя, які звяртаецца да свайго сумлення і ўнутранага «я». І. Навуменка намаляваў заглыблены псіхалагічны вобраз малога хлопчыка-беларуса, які вырастае ў падлетка і юнака, прычым праходзіць працэс самапазнання і эвалюцыю мыслення ў атмасферы рэальнага, складанага і драматычнага быцця. Гэта індывідуалізаваны вобраз рэфлексіўнага юнака Васіля Войціка, чыё жыццё звязана з вялікім гістарычным часам і яго катастрофамі. Разам з тым галоўны герой з'яўляецца тыповым персанажам, бо ўвасабляе лёс цэлага пакалення.

Жанрава-стылёвая спецыфіка аповесцей пісьменніка ў значнай ступені звязана са сталымі формамі аўтарскага маўлення. У аповесцях «Дзяцінства» і «Падлетак» празаік прытрымліваўся аповеду ад імя трэцяй асобы ў форме цяперашняга часу. Дзякуюы гэтаму логіка падзей вельмі натуральна перадавалася ў адпаведнасці з узроўнем развіцця, псіхалагічнага стану дзіцяці-падлетка, з якім чытач пачынае знаёміцца з сямігадовага ўзросту. Па словах Л. Алейнік, «сама назва трылогіі І. Навуменкі падкрэслівае, што ў працы <…> аўтар свядома арыентаваўся на мастацкія ўзоры рускіх класікаў, найперш – Льва Талстога. Але па сваёй аснове (не толькі па сюжэтных перыпетыях, апавядальнай манеры, творчых прыёмах і мастацкіх акцэнтах, але, галоўнае, па сваёй гістарычна-ментальнай сутнасці) гэты твор самабытны і арыгінальны» [5].

У трыпціху «Дзяцінства», «Падлетак», «Юнацтва» маральная ацэнка і асэнсаванне падзей вайны змяняюцца ад узвышана-ўзнёслага да ўсвядомленага: *«Чаму ты, дзед, не быў на вайне? – Хай на яе ліха, на тую вайну, унучак. Нічога добрага там няма. Смерць, забойства»* [6, с. 26]. З цягам часу ў творчай манеры пісьменніка адбываецца змяшчэнне акцэнтаў у бок жорстка-рэалістычнага паказу смерці «хлопцаў-равеснікаў» на вайне. Па словах П. Васючэнкі, такі паказ «генетычна звязаны з той традыцыяй, якую заклалі ў сусветнай літаратуры Стэндаль, Л. Талстой, Э. М. Рэмарк, А. Барбюс, М. Гарэцкі, Э. Хэмінгуэй, Ю. Бондараў, В. Быкаў» [7, с. 701].

Адной з характарыстык ранняй прозы І. Навуменкі было аптымістычнае светаадчуванне. Напрыклад, у славутым апавяданні «Семнаццатай вясной» (1956) пра жыццё беларускіх падлеткаў пад акупацыяй прысутнічае гумар і самаіронія, характэрныя для тэмы развітання з дзяцінствам, з кніжнымі ілюзіямі. В. Каваленка пісаў пра І. Навуменку: «Ён больш аптыміст, чым песіміст, бо як пісьменнік дэмакратычных перакананняў больш за ўсё верыць у народную энергію жыццятворчасці, чым у інтэлігенцкую» [8, с. 11]. І сапраўды, герой І. Навуменкі стаў самым выбітным з вобразаў тых учарашніх савецкіх школьнікаў, якія рабіліся выдатнымі байцамі і прыходзілі да выпрацоўкі ўласных поглядаў не толькі на вайну, але і на жыццё ў цэлым.

Сама тэма ініцыяцыі на вайне звязвае аповесці І. Навуменкі з плёнам еўрапейскага «страчанага пакалення», што сталела на франтах Першай сусветнай вайны. Гэта дало падставы Л. Сіньковай заўважыць: «І нічым, як толькі інерцыяй уздзеяння былой савецкай цэнзуры на трактоўку беларускай

аўтабіяграфічнай прозы “ваенных” аўтараў, мы не можам патлумачыць гэтакую малалікую прысутнасць беларускіх імёнаў у самім ідэйным комплексе “страчанага пакалення”, у слаўнай кагорце тых пісьменнікаў, якія адлюстравалі вайну з пункту гледжання ўчарашняга школьніка» [9]. Разам з тым у аповесцях пісьменніка пра Вялікую Айчынную вайну была і тая спецыфіка, што адрознівала яго светапогляд ад пазіцый замежных папярэднікаў. Герой І. Навуменкі разумее сваю вызваленчую місію і салдацкі абавязак. Н. Пыско адзначыла: «І гэта кардынальна адрознівае яго пакаленне ад “страчанага пакалення” Першай сусветнай, у прадстаўнікоў якога не было адказу на пытанне, дзеля чаго яны апынуліся на бессэнсоўнай крывавай бойні ў цэнтры “цывілізаванай” Еўропы» [2, с. 662].

У трылогіі створаны вобраз сялянскага хлопца, які на першых этапах жыццёвага шляху недастаткова поўна разумее грамадскія з’явы, але імкнецца даць ім сваю ацэнку. Яго свядомасць фіксуе падзеі калектывізацыі, раскулачвання, сталінскія рэпрэсіі, ваенныя дзеянні. Разуменне наратарам гістарычных рэалій праяўляецца апасродкавана, праз успрыманне трэціх асоб, або павярхоўна, з пазіцый падлеткавага несфарміраванага ўсведамлення. У аповесці «Падлетак» сталенне Васіля адбываецца разам са змяненнем палітычнай і гістарычнай сітуацыі. І. Навуменка ствaрыў своеасаблівую ваенную прэамбулу, інтэрпрэтуючы падзеі пачатку Другой сусветнай вайны і вайны з Фінляндыяй праз суб’ектыўнае і несвядомае стаўленне лірычнага героя: *«Ва ўсялякім выпадку, пра рэальную вайну Васіль не думае або думае вельмі мала»* [6, с. 268]; *«Васіль лічыў вайну з Фінляндыяй несур’ёзнай. Колькі тых фінаў»* [6, с. 269].

Аповесць «Юнацтва», блізкая па матывах да рамана І. Навуменкі «Смутак белых начэй» (1979), адлюстравала жыццё Васіля Войціка ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Фронт пачаўся для хлопца-партызана мабілізацыяй падчас вызвалення Беларусі і голадам у запасных вайсковых частках, затым былі баі на Карэльскім перашыйку і служба ў якасці палкавога разведчыка і перакладчыка. Аўтабіяграфічны герой удзельнічае ў вызваленні Усходняй Прусіі і сустракае перамогу ў Верхняй Сілезіі. Нягледзячы на дваццацігадовы ўзрост, у аповесці «Юнацтва» персанаж І. Навуменкі – асоба цалкам сфарміраваная. Асобасны рост дазваляе Васілю з пазіцый шараговага ўдзельніка ваенных падзей даць адэкватную ацэнку сітуацыі і становішчу на франтах. Празаік праўдзіва намаляваў рэйды знішчальнага батальёна, у які траплялі школьнікі з бутафорскімі вучэбнымі вінтоўкамі, а трэба было знішчаць нямецкіх парашуцістаў і шпіёнаў у першыя дні вайны; аб’ектыўна паказаў таксама адносіны фашыстаў да насельніцтва падчас акупацыі, адлюстраваў палітычную сітуацыю ў краіне; намаляваў цяжкасці і нястачы жыцця партызан у непрытульным асеннім і зімовым лесе. На прыкладзе старшыні Мігайлы, групы лётчыкаў-разведчыкаў, самога Васіля Войціка пісьменнік паказаў далейшы лёс салдат і адносіны «Смерша» да тых, хто ў час баявых дзеянняў прапаў без вестак, вымушана перайшоў лінію фронту, быў пад акупацыяй, адстаў ад сваіх або згубіў дакументы. Пісьменнік у аповесці «Юнацтва» пераканаўча адлюстраваў ваенны побыт: складанасці з боезабеспячэннем, пастаяннае адчуванне голаду, бяссонне, але – і кемлівасць, розум, маладую сілу сумленнага байца. Л. Сінькова адзначала: «Яшчэ адна тэма, якая паўтараецца ў творах І. Навуменкі – гэта тэма страчанага маладога кахання, страчанага часу для прагнай вучобы, для таго светлага ў жыцці, што давялося прызнаць незваротна адабраным вайной. Псіхалагічна глыбока, тонка сказаў пра гэта менавіта І. Навуменка – у адрозненне ад тых беларускіх аўтараў, якія пісалі пра “страчанае пакаленне” найперш як пра забітае, замучанае, духоўна скалечанае» [9].

Творы І. Навуменкі адзначанага перыяду характарызуюцца адсутнасцю прэтэнзій на філасафічнасць. Па словах М. Тычыны, «пісьменнік абдумана пазбягае філасофствавання, якое можа здацца ненатуральным ва ўмовах жыцця, калі само жыццё можа абарвацца ў любое імгненне» [10, с. 385]. У трыпціху «Дзяцінства», «Падлетак», «Юнацтва» сталенне галоўнага героя адбываецца пад уплывам абставін і праходзіць эвалюцыю разам са змяненнем аўтарскага светаразумення, бо падчас стварэння гэтых аповесцей празаіку было пад семдзесят год. У мастацкай спадчыне І. Навуменкі традыцыйна адзначаецца сістэма разнастайных паўтораў, выкліканых аўтабі-

яграфічным характарам творчасці. Па словах І. Баўтрэль, «большасць даследчыкаў пагаджаецца з тым, што паўтор у звароце да пэўнай тэмы, героя, факта, спосабу падачы матэрыялу і г.д. звязаны з іх пераасэнсаваннем, пераацэнкай» [11, с. 786]. Час вызначэння новых ракурсаў і прырода аўтабіяграфізму пісьменніка сталі галоўнымі прычынамі для пераасэнсавання падзей. Паводле выказвання Н. Пыско, «гэтай асаблівасцю мастацкай манеры і мастакоўскай індывідуальнасці І. Навуменка тыпалагічна блізкі старэйшаму сабрату па пяру У. Фолкнеру» [2, с. 668]. У мастацка-эстэтычным плане відавочны таксама зварот празаіка да эпічнай традыцыі Я. Коласа, што найбольш поўна выявілася ў адзначанай аўтабіяграфічнай трылогіі.

**Асноўныя матывы аповесцей 1990-х гг.**

У аповесці «Гасцініца над Прыпяццю» (1994) асэнсаваннем наступстваў катастрофы І. Навуменка прытрымліваўся элегічна-мінорнага ладу апавядання. Працягам узгаданай вышэй аўтабіяграфічнай трылогіі з’явілася і аповесць «Любімы горад» (1996). У гэтым творы адлюстраванне жыцця шматграннае, але тон апавядання таксама сумны. Пісьменнік патлумачыў змены настрою, мадальнасці ў сваёй прозе наступным чынам: «Я пісаў апошнюю сваю аповесць з біяграфічнага цыкла – “Любімы горад” – і адчуваў (пішаш не розумам, а пачуццём, падсвядомасцю), што дзесьці ўсё-такі мінор, сумна. Чаму сумна? А таму, што тыя хлопцы, з якімі я радаваўся, марыў, якіх я ведаў, – яны ж не вярнуліся. І вось гэты налёт – я цяпер ужо і розумам дайшоў – ляжыць на гэтай аповесці… Словам, вайна ёсць вайна, жорсткая, крывавая» [12, с. 5]. Аповесць «Дзясяты клас» (1998) працягнула ідэйна-тэматычную лінію паказу пакалення, жыццё якога пасля ваенных выпрабаванняў не палепшылася, а ішло ў рэчышчы выжывання, змагання з нягодамі і пошукаў свайго прызначэння. І яшчэ над адной аповесцю на зыходзе жыцця, у канцы 1990-х гг., працаваў І. Навуменка – «Помні Сталінград» (2000). Вобраз галоўнага героя Івана Дразда па ўзросце і мастацкім напаўненні сімвалічна набліжаны да вобразаў Васіля Войціка і Грышы Ладуценкі; ён, традыцыйна для пісьменніка, увасабляе маладое пакаленне, ідэалы якога загартоўваліся ў перыяд ваенных выпрабаванняў.

У названых творах вар’іруецца некалькі падобных матываў. Адзін з іх – матыў памяці, вяртання да мінулага, перажытага. Былы мастак Андрэй Івашка з аповесці «Гасцініца над Прыпяццю» па розных прычынах некалькі разоў вяртаецца ў мясціны сваёй маладосці, пераасэнсоўвае перажытае: *«Летась, не завітваючы ў горад на Прыпяці, Івашка праехаў па мясцінах, па якіх яны, двое сяброў-таварышаў, кіравалі ў сорак першым на Чарнобыль. Няма школьных дружбакоў: загінулі на фронце»* [13, с. 3]. Васіль Войцік з аповесці «Любімы горад» прыгадвае вайну, па-новаму асэнсоўвае падзеі і таксама імкнецца да вяртання ў мінулае, знарок праходзіць партызанскімі сцежкамі.

У аповесцях відавочны матыў уплыву сацыяльнага асяроддзя на лёс чалавека, бо ў творах І. Навуменкі асоба заўсёды выступае як сацыяльна-гістарычны феномен. У час вайны і ў мірным жыцці пісьменнік лічыў сацыяльны кантэкст дамінантным, самым важным чыннікам у рэалізацыі асобы. Галоўныя героі аповесцей «Гасцініца над Прыпяццю» і «Любімы горад» маюць падобны лёс: яны сталеюць пад уплывам абставін ваеннай і паваеннай рэчаіснасці, праходзяць вучобу ў інстытуце, маюць стасункі з людзьмі разнастайнага асяроддзя, перажываюць расчараванні ў інтымнай сферы. Глыбока раскрываюцца метамарфозы чалавечага настрою: ад паваеннай эйфарыі, народжанай Вялікай Перамогай, да стану песімізму і незадаволенасці далейшым жыццём. Празаік у аповесці «Гасцініца над Прыпяццю» прывёў Андрэя Івашку ў родныя мясціны і даў магчымасць зразумець дыялектыку жыцця ды іранічна пагадзіцца з ёю, бо беларусы мусілі пасля войнаў перажываць яшчэ шмат выпрабаванняў, у тым ліку і Чарнобыльскую катастрофу: *«Так, усё на свеце мяняецца. Толькі неабавязкова ў лепшы бок»* [13, с. 38]. Аповесць «Любімы горад» зноў праводзіць наратара шляхам расчаравання ў былых летуценнях: *«Але чамусьці не надта весела. <…> Свята не адбылося. <…> Няма ўзаемнага прымірэння, згоды, усёдаравання, якое толькі і можа наступіць пасля такой агромністай, з рэкамі крыві вайны»* [11, с. 647]. У аповесці «Дзясяты клас» пісьменнік звярнуў увагу на

факты лакіроўкі рэчаіснасці ў прэсе пры асвятленні ваенных дзеянняў 1944 г. Герой гэтай аповесці Грыша Ладуценка, спісаны з арміі, таксама вяртаецца дадому ў прыгнечаным настроі, бо вайна разбуральна паўплывала на светаадчуванне маладога чалавека. А. Марціновіч адзначыў, што «за назвай “Дзясяты клас” хаваецца і больш шырокі сэнс» [14, с. 8]. Апошні клас для Грышы Ладуценкі – гэта своеасаблівае ўваходжанне ў паваенную рэчаіснасць і выжыванне ва ўмовах, набліжаных да экстрэмальных. Твор заканчваецца на аптымістычна-сімвалічнай ноце. Грыша выратоўвае школьнікаў ад выбуху гранаты, жыццё працягваецца: *«Лёс даў Грышу Ладуценку, бадай, канчатковую карту на жыццё, на ўсё тое, што ёсць у гэтым жыцці: чорнае і белае, горкае і салодкае»* [2, с. 628]. У творы «Помні Сталінград» пісьменнік паказаў хаатычнасць ваеннай сітуацыі ў акружэнні, паніку людзей пры пагрузцы на пантоны, непадрыхтаванасць маладых пехацінцаў, адлюстраваў амаральныя дзеянні і здраду камандзіраў у адносінах да салдат падчас прарыву на фронце: *«Самае страшнае, што камандзір палка, увесь штаб зніклі ў невядомым накірунку. Гэта ганьба. Называецца – камандзіры. Завялі салдат у пастку, а самі збеглі»* [2, с. 637].

Празаік падсумоўвае перажытае, пераасэнсаванае, і ў выніку ваенны і паваенны часавыя пласты твораў «Гасцініца над Прыпяццю» і «Любімы горад» зліваюцца, працягваюць адзін аднаго, яны не маюць катэгарычнага размежавання. У аповесці «Гасцініца над Прыпяццю» падкрэслена, што і праз некалькі дзесяцігоддзяў пасля вайны не паменела выпадкаў несправядлівага абыходжання з чалавекам, прыкладаў крывадушнасці ў дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі, праяў бязладдзя ў гаспадаранні, у эканоміцы. Сітуацыя ў глыбінях жыцця дзяржавы засталася статычнай. Вайна скончылася, але нейкім чынам яна нібы працягваецца. У анкетах трэба пісаць, ці быў у палоне, акружэнні, акупацыі, чым займаўся. Оперупаўнаважаныя адпаведных службаў востра цікавяцца гэтымі пытаннямі («Любімы горад»). Арышт бацькі паставіў Андрэя Івашку («Гасцініца над Прыпяццю») перад выбарам «правільнага» запісу ў анкеце; пасля вайны ў сітуацыі лакіроўкі фактаў і адсутнасці свабоды падчас працы ў рэдакцыі газеты перад Васілём Войцікам («Любімы горад») таксама паўстае аналагічная праблема «правільнага» выбару. У аповесці «Помні Сталінград» І. Навуменка працягнуў паказ дзеянняў смершаўцаў: пошук ворагаў і вярбоўку людзей на службу ў органы дзяржаўнай бяспекі з карнымі функцыямі. Адначасова празаік вывеў на першы план юнака Івана Дразда як свядомага, разважлівага чалавека, які здольны даваць ацэнку любой сітуацыі і ў крытычных абставінах рабіць маральны выбар. Аналізуючы асаблівасці псіхалогіі салдат на вайне, расійскі спецыяліст у галіне ваенна-гістарычнай антрапалогіі А. Сяняўская падкрэсліла, што ў воінаў панаваў «цэлы комплекс думак і пачуццяў, складаны псіхалагічны настрой» [15, с. 181], які мог весці да разбурэння псіхічных норм і трагедый.

Аповесці «Юнацтва», «Гасцініца над Прыпяццю», «Любімы горад», «Дзясяты клас», «Помні Сталінград» паяднаны шэрагам матываў, традыцыйных для пісьменніка, чыё юнацтва было ахвяравана вайне (сутыкненне наіўнага школьніка з вайной, страта ілюзій савецкім юнаком, яго вернасць ідэалам сумленнасці, сяброўства, самаадданай працавітасці, цікаўнасці да ўсяго новага і незнаёмага, а таксама да гісторыі ўласнай краіны, дзе прайшло жыццё). Прынцып аўтабіяграфізму як аўтарская стратэгія дазволіў пісьменніку вельмі канкрэтна і дакладна адлюстраваць праявы і пазітыўнага, і негатыўнага ў мінулым, і гэтая агульназначная праўда савецкага часу забяспечвае наватарскі змест разгледжаных твораў І. Навуменкі. Аўтар імкнуўся падкрэсліць індывідуальнасць чалавека з натоўпу на фоне дамінуючай увагі да народа як масы. У аповесці «Помні Сталінград» празаік працягнуў паказ вярбоўкі людзей на службу ў карныя органы, пошук ворагаў. Адначасова пісьменнік стварыў вобраз свядомай, здольнай да правільнага маральнага выбару асобы. У творчай спадчыне празаіка прасочваецца матыў пошуку прызначэння чалавека. І. Навуменка сцвярдждаў, што дзеля гэтага трэба пачаць з сябе, з сумленнага асэнсавання ўласнага жыццёвага шляху. Пісьменнік правёў паралелі паміж часавымі пластамі – ваенным мінулым і сучаснасцю – і засцярог чалавека ад небяспекі здрады сабе і сваім першавытокам.

**Заключэнне**

Такім чынам, жанр аповесці ў творчасці І. Навуменкі перыяду 1990-х гг. захаваў традыцыйную для пісьменніка сюжэтна-кампазіцыйную мадэль аўтабіяграфічнага апавядальнага ладу. Трылогія аповесцей «Дзяцінства», «Падлетак», «Юнацтва», а таксама творы «Гасцініца над Прыпяццю», «Любімы горад», «Дзясяты клас», «Помні Сталінград» паяднаны шэрагам матываў, традыцыйных для пісьменніка, чыё юнацтва было ахвяравана вайне. Гэта такія матывы, як сутыкненне наіўнага школьніка з вайной, страта ілюзій савецкім юнаком, яго вернасць ідэалам сумленнасці, сяброўства, самаадданай працавітасці, цікаўнасці да ўсяго новага і незнаёмага, а таксама да гісторыі ўласнай краіны і дзяржавы, дзе прайшло жыццё. Прынцып аўтабіяграфізму як аўтарская стратэгія дазволіў пісьменніку вельмі канкрэтна і дакладна адлюстраваць праявы і пазітыўнага, і негатыўнага ў мінулым, што сталася прыкметай наватарства зместу разгледжаных твораў І. Навуменкі. На фоне дамінуючай увагі да народа як масы аўтар імкнуўся падкрэсліць індывідуальнасць чалавека: паказаць вобраз свядомай, разважлівай асобы, якая здольная даваць ацэнку любой сітуацыі і ў крытычных абставінах рабіць маральны выбар. Адпаведна, у творчасці празаіка 1990-х гг. дамінантным застаўся матыў пошуку прызначэння чалавека ў розныя гістарычныя эпохі.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Навуменка, І. Мае героі былі рамантыкамі: стэнаграма размовы з народным пісьменнікам Беларусі Іванам Навуменкам у БДУ / І. Навуменка // Беларускае літаратуразнаўства : навук.-метад. зб. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: Л. Д. Сінькова (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2008. – Вып. 6. – С. 115–124.

2. Навуменка, І. Збор твораў : у 10 т. / І. Навуменка. – Мінск : Маст. літ., 2012–2017. – Т. 4 : Аповесці, 1991–2000. – 2014. – 846 с.

3. Шаладонаў, І. Станаўленне чалавека ў мастацкай прасторы часу аповесцяў І. Навуменкі «Дзяцінства», «Падлетак», «Юнацтва» / І. Шаладонаў // Творчасць Івана Навуменкі: славянскі, еўрапейскі, сусветны кантэкст : Рэсп. навук. канф. да 85-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі акадэміка І. Я. Навуменкі, Мінск, 16 лют. 2010 г. / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. ; рэдкал.: С. С. Лаўшук (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 436–441.

4. Сінькова, Л. Д. Размаўляючы з Іванам Навуменкам / Л. Д. Сінькова // Творчая асоба І. Навуменкі і праблемы беларускай філалогіі і адукацыі : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: Т. І. Шамякіна (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2006. – С. 75–85.

5. Алейнік, Л. Канцэпцыя станаўлення асобы ў трылогіях І. Навуменкі «Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва» і Л. Талстога «Детство. Отрочество. Юность» [Электронны рэсурс] / Л. Алейнік // Livejournal. – 2010. – Рэжым доступу: https://lit-krytyka.livejournal.com. – Дата доступу: 28.09.2021.

6. Навуменка, І. Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва / І. Навуменка. – Мінск : Юнацтва, 2000. – 510 с.

7. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: У. В. Гніламёдаў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1999–2015. – Т. 3 : 1941–1965. –2002. – 952 с.

8. Каваленка, М. А. Беларускія пісьменнікі-лаўрэаты / М. А. Каваленка. – Мінск : Дзярж. б-ка, 1987. – 310 с.

9. Сінькова, Л. Д. Творчасць Івана Навуменкі ў люстэрку ідэй «страчанага пакалення» [Электронны рэсурс] / Л. Д. Сінькова // Кампаратывістыка. Публікацыі. – 2015. – Рэжым доступу: http://lsinkova.by/творчасць-івана-навуменкі-ў-люстэрку. – Дата доступу: 29.01.2020.

10. Тычына, М. Народ і вайна / М. Тычына. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – 433 с.

11. Навуменка, І. Збор твораў : у 10 т. / І. Навуменка. – Мінск : Маст. літ., 2012–2017. – Т. 3 : Аповесці, 1957–1996. – 2013. – 878 с.

12. Навуменка, І. Давайце верыць у чалавека : гутарка з Іванам Навуменкам. Запісаў Мікола Чэмер / І. Навуменка // ЛіМ. – 1996. – 19 ліп. – С. 5, 12.

13. Навуменка, І. Гасцініца над Прыпяццю : аповесці і апавяданні / І. Навуменка. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 253 с.

14. Марціновіч, А. З вышыні пражытага: Штрыхі да творчага партрэту І. Навуменкі / А. Марціновіч // Роднае слова. – 2000. – № 2. – С. 4–8.

15. Сенявская, Е. С. Психология войны в ХХ веке: исторический опыт России / Е. С. Сенявская. – М. : РОССПЭН, 1999. – 347 с.

REFERENCES

1. Navumenka, I. Maje heroi byli ramantykami: stenahrama razmovy z narodnym pis'miennikam Bielarusi Ivanam Navumienkam u BDU / I. Navumienka // Bielaruskaje litaraturaznaustva : navuk.-mietad. zb. / Bielarus. dziarzh. un-t ; redkal.: L. D. Sin'kova (starsh.) [i insh.]. – Minsk, 2008. – Vyp. 6. – S. 115–124.

2. Navumienka, I. Zbor tvorau : u 10 t. / I. Navumienka. – Minsk : Mast. lit., 2012–2017. – T. 4 : Apovesci, 1991–2000. 2014. – 846 s.

3. Shaladonau, I. Stanauliennie chalavieka u mastackaj prastory chasu apoviesciau I. Navumienki «Dziacinstva», «Padlietak», «Junactva» / I. Shaladonau // Tvorchasc' Ivana Navumienki: slavianski, jeurapiejski, susvietny kantekst : Resp. navuk. kanf. da 85-hoddzia z dnia naradzhennia narodnaha pis'miennika Bielarusi akademika I. Ya. Navumienki, Minsk, 16 liut. 2010 h. / NAN Bielarusi, In-t movy i lit. ; redkal.: S. S. Laushuk (hal. red.) [i insh.]. – Minsk, 2010. – S. 436–441.

4. Sin'kova, L. D. Razmauliajuchy z Ivanam Navumienkam / L. D. Sin'kova // Tvorchaja asoba I. Navumeinki i prabliemy bielaruskaj filalohii i adukacyi : zb. navuk. art. / Bielarus. dziarzh. un-t ; redkal.: T. I. Shamiakina (starsh.) [i insh.]. – Minsk, 2006. – S. 75–85.

5. Алейнік, Л. Канцэпцыя станаўлення асобы ў трылогіях І. Навуменкі «Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва» і Л. Талстога «Детство. Отрочество. Юность» [Электронны рэсурс] / Л. Алейнік // Livejournal. – 2010. – Рэжым доступу: https://lit-krytyka.livejournal.com. – Дата доступу: 28.09.2021.

5. Alejnik, L. Kancepcyja stanauliennia asoby u trylohijakh I. Navumienki «Dziacinstva. Padlietak. Junactva» i L. Talstoha «Dietstvo. Otrochiestvo. Junost'» [Eliektronny resurs] / L. Alejnik // Livejournal. – 2010. – Rezhym dostupu: https://lit-krytyka.livejournal.com. – Data dostupu: 28.09.2021.

6. Navumienka, I. Dziacinstva. Padlietak. Junactva / I. Navumienka. – Minsk : Junactva, 2000. – 510 s.

7. Historyja bielaruskaj litaratury XX stagoddzia : u 4 t. / Nac. akad. navuk Bielarusi, In-t lit. imia Ja. Kupaly ; redkal.: U. V. Hnilamiodau (hal. red.) [i insh.]. – Minsk : Bielarus. navuka, 1999–2015. – T. 3 : 1941–1965. – 2002. – 952 s.

8. Kavalenka, M. A. Bielaruskija pis'mienniki-laureaty / M. A. Kavalienka. – Minsk : Dziarzh. b-ka, 1987. – 310 s.

9. Sin'kova, L. D. Tvorchasc' Ivana Navumienki u liusterku idej «strachanaha pakaliennia» [Eliektronny resurs] / L. D. Sin'kova // Kamparatyvistyka. Publikacyi. – 2015. – Rezhym dostupu: http://lsinkova.by/tvorchasc'-ivana-navumienki-u-liusterku. – Data dostupu: 28.09.2021.

10. Tychyna, M. Narod i vajna / M. Tychyna. – Minsk : Bielarus. navuka, 2015. – 433 s.

11. Navumienka, I. Zbor tvorau : u 10 t. / I. Navumienka. – Minsk : Mast. lit., 2012–2017. – T. 3 : Apoviesci, 1957–1996. – 2013. – 878 s.

12. Navumienka, I. Davajce vieryc' u chalavieka : hutarka z Ivanam Navumienkam. Zapisau Mikola Chemier / I. Navumienka // LiM. – 1996. – 19 lip. – S. 5, 12.

13. Navumienka, I. Hascinica nad Prypiacciu : apoviesci i apaviadanni / I. Navumienka. – Minsk : Mast. lit., 1994. – 253 s.

14. Marcinovich, A. Z vyshyni prazhytaha: Shtrykhi da tvorchaha partretu I. Navumienki / A. Marcinovich // Rodnaje slova. – 2000. – № 2. – S. 4–8.

15. Sieniavskaja, Ye. S. Psikhologija vojny v XX viekie: istorichieskij opyt Rossii / Ye. S. Sieniavskaja. – M. : ROSSPEN, 1999. – 347 s.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 08.09.2021*